ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 101 (1370) | АЎТОРАК, 5-га мая 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.

Прынесьці перамогу цэхам

Мы ўступілі і выконваем пляны ...га кварталу 3-га, рашаючага году ...ці годкі.

Мінула 2 месяцы пасьля гістарыч...й прамовы т. Сталіна на Усеса...най нарадзе працаўнікоў прамы...овасьці. Лёзунг: „Час бальшавікам ...мім стаць спэцыялістымі... баль...вікі павінны аўладаць тэхнікай... ...тэхніка ў пэрыод рэконструкцыі ...рашае ўсё“ пракаціўся па Са...цкім Саюзе і выклікаў Усесаюзны ...ход комсамолу за аўладаньне на...кай і тэхнікай.

Рацыяналізацыя вытворчасьці па...ына штогодна даць мільёны руб...ў экономіі.

Паход за тэхніку павінен выя...ць і узброіць сотні і тысячы рацыяна...ватараў вытворчасьці, людзей якія ...йдуць на штурм адсталых вучас...аў, будуць змагацца за палепшань... якасьці продукцыі і узьняцьце ...творчасьці працы.

Неабходна скарыстаць увесь да...тны вопыт, організаваць сапраўд...ы соцыялістычны абмен вопытам, ...арыстоўваючы усё дадатнае з бо...у перадавых прадпрыемстваў, каб ...а падставе гэтага вопыту разгорт...ць барацьбу за тэхніку, за тэм...ы плюс якасьць.

Мінула 2 месяцы. Сеньня мы ...мяшчаем пастанову аб распача...ай ЦКК РСІ, ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ ...-хдэкадніку праверкі становішча ...згортваньня паходу за тэхніку.

Гэтая баявая праверка павінна ...ыявіць наколькі праца па аўла...аньні тэхнікай увязана з барацьб...ой за выкананьне вытворчых пля...аў, барацьбой за рацыяналізацыю ...ытворчасьці.

Комсамольскія ячэйкі і РК па...інны зараз-жа ўключыцца у пра...ерку з тым, каб мобілізаваць ува...у ўсёй організацыі на барацьбу са ...кажэньнямі ў разгортваньні паходу, ...а пераключэньне барацьбы за тэх...іку на фронт барацьбы за прам...інпляны.

Праверка павінна выявіць прой...зены шлях і адзначыць конкрэт...ыя напрамкі для разгортваньня ...аходу за тэхніку ў адпаведнасьці ...вытворчымі ўмовамі асобных ком...амольскіх організацый, з тым, каб ...зброіўшыся тэхнічнымі ведамі, аў...адаўшы тэхнікай сваёй вытвор...асьці, прынесьці канчатковую пе...амогу сваім цэхам у 3-м, рашаю...чым годзе пяцігодкі.

Шматтысячныя рабочыя дэмонстрацыі ў Польшчы

Поліцэйскія атакі супроць мітынгаў

ВАРШАВА. 3— У дзень 1-га мая, у Сасновіцах (Дамброўскі басэйн) адбыўся 3-хтысячны мітынг рабочых. На мітынгу былі разгорнуты 6 комуністычных сьцягоў і транспрантаў. У час выступленьня прамоўцы, які заклікаў рабочых да барацьбы супроць пагрозы вайны і да абароны СССР, поліцыя адкрыла страляніну, 4 чалавекі цяжка паранены. Пасьля абстрэлу мітынгу, поліцыя зрабіла шматлікія арышты.

У Чэлядзі, Гродзецы і Пяскове адбыліся дэмонстрацыі каля 2.000 чалавек рабочых. Дэмонстрацыі былі разагнаны значным атрадам поліцыі, прычым дэмонстранты ўпарта супраціўляліся, закідаючы поліцыю камянямі.

У Дамброве поліцыя расьсеяла комуністычны мітынг 2 тысяч чалавек. Арыштавана звыш 100 чалавек. У Лодзі 1-га мая на адным рынку адбыўся мітынг 6.000 рабочых. З прамовай выступіў комдэпутат т. Данецкі, поліцыя зрабіла атаку на мітынг і разагнала яго. Комдэпутат т. Данецкі быў зацягнуты ў браму аднаго з дамоў і моцна зьбіты.

У Макевічах (Ковенскага павету, Валынскага ваяводзтва) сельробам была організавана дэмонстрацыя сялян. Удзельнічала звыш 1.000 чалавек, якія несьлі плякаты з рэволюцыйнымі лёзунгамі. На дэмонстрантаў абрушылася поліцыя. Завязалася перастрэлка, у час якое забіты двое сялян, шмат паранена ў тым ліку трое поліцэйскіх. У Галобах (той-жа павет) у выніку першамайскай сутычкі з поліцыяй забіта і паранена шмат сялян. Газэта „Польска“ паведамляе, што сяляне ў Ковенскім павеце, каб перашкодзіць поліцыі ў дзень 1-га мая, перарэзалі ў многіх мясцох тэлефонныя правады.

Гарады Манчжурыі наводнены поліцыяй

ШАНХАЙ. 2.—Як паведамляюць з Харбіна, 1 мая ў Цзіндао (прымежны з Корэяй раён Гірынскай провінцыі), адбылося некальмі дэмонстрацый, якія былі разагнаны сумесна японскай і кітайскай поліцыяй, якая зрабіла шматлікія арышты. 1-га мая ўсе гарады Манчжурыі былі наводнены поліцыяй, ахраньнікамі і ваеннымі атрадамі.

Сьвяткаваньне 1-га мая ў савецкай калёніі Харбіна прашло без інцыдэнтаў, хаця програма сьвяткаваньня па запатрабаваньню кітайскае ўлады была значна ўрэзана. Белагвардзейскімі організацыямі была распаўсюджвана ў горадзе вялікая колькасьць лістовак з пагрозамі па адрасу прадстаўнікоў СССР. У некалькіх мясцох былі выпадкі, калі белагвардзейцы зрывалі савецкія сьцягі.

Сутычкі дэмонстрантаў з поліцыяй

БЭРЛІН. 3. Ва ўсіх буйных гарадох Нямеччыны адбыліся масавыя першамайскія дэмонстрацыі рэволюцыйнага пролетарыяту. У Цюрыху ў комуністычнай дэмонстрацыі прыняла ўдзел каля 5 тысяч рабочых. Жэнэве, дзе таксама адбыліся шматлюдныя дэмонстрацыі, былі сутычкі з поліцыяй. У горадзе Галле ў дэмонстрацыі прынялі ўдзел звыш 5 тысяч чалавек.



Лятучка да першамайскай комуністычнай дэмонстрацыі.

Забастоўка трамвайных рабочых

ВЕНА. 2. У дзень 1-га мая, нягледзячы на забарону венскага муніцыпалітэту, трамвайныя рабочыя, па закліку рэволюцыйнай профопозыцыі, забаставалі. Комуністычная партыя організавала ў Вене ў 20-ці раёнах сходы, пасьля якіх было наладжана шэсьце к цэнтральнаму пункту—пляцу Волі, дзе адбыліся адначасова 4 масавыя мітынгі. Потым адбылося шэсьце па галоўных вуліцах, у якім прынялі ўдзел больш 7 тысяч чалавек.

У 33-х провінцыйных гарадох адбыліся першамайскія мітынгі.

Арышты і расстрэлы

ШАНХАЙ. 2. 1-га мая ва ўсіх раёнах Шанхаю ў вялікай колькасьці распаўсюджваліся комуністычныя лістоўкі.

Як паведамляе аг. Гоміньз Сватоў, напярэдадні 1 мая арыштавана звыш 100 комуністых, з якіх 88 расстраляны.

20-га мая пачынаецца ўсебеларускі месячнік друку

Сьвяткаваньне дня друку па БССР пераносіцца на 20-е мая

Пастанова Сэкратарыяту ЦК КП(б)Б


Сэкратарыят ЦК КП(б) прыняў пастанову аб сьвяткаваньні ў БССР дня друку.

З 20-га мая па БССР абвяшчаецца ўсебеларускі месячнік пролетарскага друку, які павінен будзе зьявіцца сустаўной часткаю падрыхтоўкі да ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

Сьвяткаваньне дня друку па БССР пераносіцца на 20-ае мая.

Нумары газэт ад 20-га мая цалкам прысьвячаюцца пачатку ўсебеларускага месячніка друку. Сэкратарыят ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове абавязвае ўвесь цэнтральны, гарадзкі, раённы і шматтыражны друк БССР сыстэматычна і падрабязна асьвятляць ход усебеларускага месячніка друку, кампаніі перавыбараў рэдколегій нізавых газэт і падрыхтоўкі да ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

Уся работа па правядзеньню месячніка друку павінна быць органічна злучана з практычным ажыцьцяўленьнем пастановы ЦК УсеКП(б) ад 16-га красавіка аб перабудове рабселькораўскага руху.



Першае Мая ў Маскве.

KAMPFMAI

А. ПРОКО

Напярэдадні 1-га Мая

(Ад корэспондэнта „Ч.З.“)

„Першае Мая. асабліва для моладзі, было заўсёды днём барацьбы. 15 год таму назад 1-га мая 1916 году Карл Лібкнэхт дэмонстраваў на Потсдамскай плошчы сумесна з рэволюцыйнай моладзьдзю, супроць вільгельмскага ўраду і супроць вайны, Таксама яі і раней чуецца баявы заклік працоўнай моладзі“

Так пачынаецца адозва Цэнтральнага камітэту комсамолу Нямеччыны да Першага Мая. Больш чым калі, 1-ае Мая 1931 году дзень баявы для працоўнае моладзі Нямеччыны. 1,2 мільёна працоўнае моладзі выкінуты з процэсу продукцыі. Гэта армія беспрацоўных ня мае ніякай пэрспэктывы ў капіталістычнай Нямеччыне.

Права паміраць з голаду

Але рэволюцыйная моладзь узяла сабе права змагацца

Наступ фашызму на правы моладзі ўсё больш і больш узмацняецца. Небясьпека „працоўнае павіннасьці“ становіцца ўсё больш рэальнай. Гэта павіннасьць адзначае для рабочае моладзі дэградацыю на становішча нявольнікаў і штрэйкбрэхераў, бо гэта „працоўная армія“ фактычна і мяркуецца як штрэйкбрэхерская армія, якая павінна задушыць ўсякі наступ рабочае клясы.

Ня лепшая доля чакае і тую рабочую моладзь, якая яшчэ находзіцца ў процэсе продукцыі. Новая прапанова соцыял-фашысцкіх бонз ўвесьці 40 гадзіны рабочы тыдзень без адпаведнага павялічэньня зарплаты азначае зьніжэньне зарплаты ад 15 да 20 процантаў. А „добраахвотная працоўная павіннасьць“ на пазатарыфных пачатках, якую патрабуюць соцыял-фашыстыя азначае практычнае ўвядзеньне гэтай катаржнай прымусовай павіннасьці.

„Але 1 мільён беспрацоўнай моладзі не адчувае патрэбы у прымусе Яны будуць працаваць, але пры аднэй умове: пры чалавечых умовах і пры адпаведнай зарплаце“ (Юнге Гардэ). А проэкты фашыстых і соцыял-фашыстых усіх колераў не дадуць работу і хлеб—яны павялічаць толькі патрэбу і голад працоўных.

Супроць гэтага рабочая моладзь будзе змагацца 1-га Мая!

Але моладзь выстаўляе ня толькі свае спэцыфічныя запатрабаваньні 1-я Мая.

„Ніколі раней нямецкі пролетарыят не праводзіў свой баявы дзень у такой сітуацыі абвостраных клясавых адносін, развалу ўсіх асноў капіталізму і трыумфу ўсіх асноў рэволюцыйнага марксызму-ленінізму“ (Тэльман —у артыкуле „Баявы Май за савецкую Нямеччыну“).

Сумесна з фактычным павялічэньнем беспрацоўя (бо часовае, сэзоннае „зьмяншэньне“ беспрацоўя дало процанты рост беспрацоўя супроць мінулага году ў гэтую пару), сумесна з новым наступам на ўсе экономічныя і палітычныя правы працоўных, сумесна са зьніжэньнем зарплаты ўзмацняецца агульны палітычны наступ фашызму, г. зн. адбіраецца магчымасьць у галадаючых крычаць супроць голаду!

Хваля забароны, тэрору расьце з кожным днём

З таго часу як уведзена апошняя „абвязковая пастанова“ Брунінга, бясконцая колькасьць рэволюцыйных сходаў забаронены, амаль ні адна дэмонстрацыя не дазволена. Плякаты, лятучкі і газэты штодзённа конфіскуюцца толькі таму, што зьмяшчаюць портрэт Ільліча, ці іншыя „злачынныя“ рэчы. У Лейпцыгу соцыял-фашысцкі поліцэй-прэзыдэнт забараніў усе пастаноўкі агітпропных труп.

На чарзе стаіць пытаньне аб тым, каб пазбавіць працоўную моладзь выбарчага права, каб увесьці цэнз—на чарзе стаіць, такім чынам, пытаньне і аб афіцыйнай ліквідацыі „дэмократыі“ —„прыдзьвер‘е соцыялізму“, згодна соцыял-фашысцкай тэрміналёгіі.

Ці можам мы сёньня гаварыць аб 1-м Мая, як аб сьвяце для нямецкага пролетарыяту? **Не, і яшчэ раз не!! Для вас, для моладзі вольнага Савецкага Саюзу, 1-е Мая—сьвята вызваленай працы! Для нямецкіх нявольнікаў капіталу 1 Мая дзень барацьбы і такім ён застанецца да часу, пакуль у нас ня будзе**

Савецкая Нямеччына!

У Нямеччыне аб сьвяце гавораць толькі соцыял-фашызм. „К чорту першае мая!“—крычаў у 1905 годзе на Кельнскім зьезьдзе профсаюзаў профбюрократ Брынгман. Пра сябе соцыял-фашызм і сёньня мармоча таксама. Але ўжо надта бурліць у радох рабочых-членаў с.-д. партыі. І соцыял-фашыстыя Бэрліна вымушаны клікаць рабочых дэмонстраваць Першага Мая.

За што соцыял-фашызм можа дэмонстраваць 1-га Мая?

Ён можа демонстраваць фактычна за зьніжэньне зарплаты, за катаржную работу для працоўнае моладзі, „за „меншае зло“ (урад Брунінга), за пазбаўленьне апошніх палітычных „правоў“ рабочых, за падрыхтоўку вайны і інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу!

Іншага і н е л ь г а патрабаваць ад „самай вялікай буржуазнай партыі“, як імянуе соцыял-фашыстых орган інтэрвэнтаў-„Дэйтше Альгэмэйне Цэйтунг“.

Мільёны працоўных Нямеччыны выступаюць на арэну барацьбы. Моладзь ідзе ў першых радох гэтае арміі.

Побач з агульнымі запатрабаваньнямі рабочае клясы Нямеччыны, яна выстаўляе свае спэцыфічныя запатрабаваньні:

Барацьба супроць зьніжэньня зарплаты—роўная плата за роўную працу!

Супроць катаржнай работы для беспрацоўнай моладзі—барацьба супроць увядзеньня „працоўнай павіннасьці“!

Поўная дапамога моладзі па беспрацоўю!

Супроць спроб пазбавіць моладзь выбарчага права—за выбарчыя правы з 18-гадовага ўзросту!

40000 членаў комсамолу, павялічваючыся тыраж газэты „Юнге Гардэ“, які увесь час павялічваецца—вось знакі, што паказваюць на пераможнае шэсьце комунізму ў радох рабочае моладзі Нямеччыны. І супроць гэтага пераможнага шэсьця не памогуць ніякія рацэпты фашызму і соцыял-фашызму. Шматлікія пераходы рабочае моладзі з фашысцкіх і соцыял-фашысцкіх організацый у комсамол пацьверджаюць гэта.

„Злучайцеся цясьней вакол комсамолу, вашага правадыра! Гэта будзе ваш пролетарскі адказ на тэрор фашызму.“

1-е Мая 1931 году на вуліцах Нямеччыны будуць дэмонстраваць баявыя калёны прыгнечаных, будуць вітаць сваім

„Рот Фронт“

сваіх братоў пераможцаў на аднэй шостай зямное кулі, будуць змагацца за перамогу на астатніх пяці шостых!

Лейпцыг, 26—IV-31 г.

ВУЧЫЦЦА ЗМАГАЦЦА Ў ЛЕНІНСКАЙ „ПРАЎДЫ

Агляд дру

У кожнай МТС, саўгасе, колгасе—насьценгазэта і шматтыражка

БАЯВЫ РУПАР І ОРГАНІЗАТАР МАС—НА КОЛГАСНЫЯ ПАЛІ

У максымальна кароткі тэрмін выканаць дырэктыву партыі і адозву „Чырвонай Зьмены“ аб організацыі пры ўсіх МТС, колгасах і саўгасах насьценгазэт альбо шматтыражак

Вопыт работы насьценных газэт саўгасу „Вішнёўка“, колгасаў „Бязбожнік“ і „Новы шлях“ павінен быць выкарыстаны ў працы іншых насьценгазэт і шматтыражак.

Шматтыражка саўгасу „Вішнёўка“, організаваўшы ўдарнікаў-рабкораў і юнкораў, актыўна змагаецца за спэцыялізацыю саўгасу. Насьценгазэта „Ударнік“ колгасу „Бязбожнік“ організавала масавую работу за пераход колгасу на зьдзельшчыну, за ліквідацыю абязьлічкі. Насьценгазэта „Новы шлях“ правяла вялікую работу за ачыстку колгасаў ад клясава варожых элемэнтаў.

Газэты ня проста фіксавалі факты, а ўздымалі іх на прынцыповую політычную вышыню і мобілізоўвалі вакол сваіх лёзунгаў шырокія масы колгасьнікаў. Газэты актыўна падтрымліваюць шырокія масы.

Комсамольскім ячэйкам трэба на сваіх сходах шырока прапрацаваць рашэньні Усесаюзнай рабселькораўскай нарады аб перабудове працы газэты і работы з рабселькорамі. Прапрацаваць пастанову ЦК Усе КП(б) аб нізавым друку і ЦК ЛКСМБ аб удзеле ў масавай самаправерцы. Мобілізаваць шырокія масы комсамольцаў і працоўнай моладзі з тым, каб у бліжэйшы час у кожным саўгасе і колгасе організаваць насьценгазэты, альбо шматтыражкі.

Помножым вопыт насьценгазэты „Ударнік“

У нас многа добрага вопыту ў рабоце паасобных насьценгазэт. Але гэты вопыт кепска перадаецца ў масы.

Вялікай увагі заслугоўвае вопыт насьценгазэты „Ударнік“ колгасу „Бязбожнік“, Лёзьненскага раёну. Газэта па-баявому ставіць актуальнейшыя пытаньні колгаснага будаўніцтва. Газэта заклікае на рашучую барацьбу супроць клясавага ворагу—кулака і падкулачніка, за організацыю магутнага колгаснага прыліву.

У газэце ёсьць конкрэтны матар'ял аб шкодніцтве клясавага ворага супроць соцыялістычнага будаўніцтва, газэта мобілізуе масы колгасьнікаў і тут-жа дае конкрэтны вопыт організацыі колгаснага прыліву, вынесьць прапанову організаваць штурмавую брыгаду колгасьнікаў, якая-б паясьніла аднаасобнікам пастановы VI-га зьезду саветаў аб колгасным будаўніцтве. Вынікі вельмі вялікія. Брыгада завербавала ў колгас 20 новых гаспадарак.

Газэта па-баявому высоўвае актуальныя пытаньне колгаснай работы: зараз-жа ўвесьці зьдзельшчыну, ацэнку ў працаднёх і неадкладна ліквідаваць абязьлічку. Тут-жа газэта піша аб тым, як гэта практычна правесьці.

Газэта высоўвае пытаньне палепшаньня колгаснай вытворчасьці, абвяшчае збор прапаноў, унутрыколгасны рацыяналізатарскі паход колгасьнікаў, як палепшыць работу аборы, стайні, як організаваць працу вытворчай нарады. Газэта організоўвае колгасьнікаў на барацьбу за лён, як вядучую культуру сельскае гаспадаркі, за другі бальшавіцкі сеў.

З мастацкага боку газэта прывабна і вельмі цікава. Пісана друкаванымі літарамі, монтажавана вырэзкамі зьнімкаў з часопісаў, і нават маляпісьменны можа добра яе чытаць. Газэта карыстаецца вялікай папулярнасьцю і аўторытэтам сярод колгасьнікаў.



Насьценгазэты ўсіх колгасаў павінны пабудаваць сваю работу так, як пабудавала яе насьценгазэта „Ударнік“, з тым, каб нашы колгасныя насьценгазэты сталі сапраўднымі барацьбітамі за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, за соцыялістычнае будаўніцтва, за 3-ці рашаючы год 5-цігодкі.

Логвін.

Па-баявому рэалізаваць пастанову ЦК УсеКП(б)

(Грэскі раён)

Насьценгазэты колгасаў „Чырвоны Шлях“, „Лекерта“ і „Чырвоная кветка“ шырока популярызуюць сярод колгасьнікаў пастановы партыі і ўраду аб задачах 2-й бальшавіцкай вясны і організацыі колгаснага прыліву.

Дзякуючы актыўнай барацьбе насьценных газэт, колгасы „Чырвоны шлях“, „Лекерта“ і „Чырвоная кветка“ па-ударнаму скончылі падрыхтоўку да вясеньняй сяўбы.

Трэба ўсё-ж адзначыць, што пастанова ЦК УсеКП(б) аб тым, каб да вясеньняй пасяўкампаніі ў кожным саўгасе, колгасе і МТС была організавана насьценгазэта ці шматтыражка выконваецца недавальняюча. З 64-х колгасаў раёну насьценгазэты маюць толькі 8.

Комсамольская організацыя Грэскага раёну павінна мобілізаваць ўсе свае сілы на выкананьне пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК ЛКСМБ, дабіцца, каб да пачатку масавай сяўбы ў кожным саўгасе і колгасе была насьценгазэта ці шматтыражка.

Т. Макарэнка

Жорстка і зубаста б'е па клясавым ворагу

Рэгулярна, кожныя 20 дзён, выдаецца насьценгазэта пры Глыбачанскай хаце чытальні (Вульскі р-н). Кожны новы нумар добра размалёваны карыкатурамі, лёзунгамі і прыцягвае ўвагу чытачоў колгасьнікаў, беднякоў і серадняКоў.

Чытаюць, абгаварваюць „Лоўка б'е па недахопах газэта і яскрава паказвае лепшых ударнікаў колгасу, барацьбітоў за колектывізацыю“—гавораць колгасьнікі.

... Гэта было ў лютым. Вышаў новы насьценгаз. Новы і надзвычайны. Аншлягі, нататкі, лёзунгі, загалоўкі выкрывалі клясавых ворагаў: Выгнаць з колгасу „Новы Шлях“ кулакоў, кулацкае гняздо пад кіраўніцтвам кулака двараніна Іляшэвіча разбурвае колгас“.

Адначасова рэдколегія выпусьціла насьценгазэту ў колгасе „Ваяўнічы Бязбожнік“, дзе таксама выкрыла шмат залезшых туды кулакоў і іншы клясава варожы элемэнт.

Выехала з раёну камісія. Праводзіла сходы, нарады. Разгаралася барацьба за ачыстку колгасаў ад кулацкіх і чужых элемэнтаў. Аказалася, што загадчык Глыбачанскай 7-мігодкі, Лабаты—былы паручык офіцэрскага корпусу, ідэйна кіраваў контр-рэволюцыйнай і шкодніцкай работай кулацкага гнязда. Аказалася, што 3 кулацкія сынкі ўступілі пад маскай колгасьнікаў у комсамол і 2 у партыю, што з кулацкім гняздом мелі сувязь старшыня райколгассаюзу, старшыня с-савету і інш.

У выніку праведзенай насьценгазэтай барацьбы за чыстку колгасаў выключана з „Новага Шляху“ 8 кулацкіх гаспадарак; з колгасу „Ваяўнічы Бязбожнік“—4 кулацкія гаспадаркі; зьняты з пасады старшыня колгасу і выключаны з партыі сэкратар Глыбачанскай парт'ячэйкі—Чумакоў; зьняты з працы і выключаны з партыі старшыня райколгассаюзу Статут; зьняты з працы старшыня сельсавету. Насьценгазэта зараз вядзе барацьбу за колгасны прыліў, за замацаваньне колгасаў.

У барацьбе за генэральную лінію партыі, у барацьбе з кулацтвам, яго агентурай—правымі і „левымі“ ухілістымі, насьценгазэта „Новы Шлях“ Глыбачанскай хатычытальні была непрымірыма, жорстка і зубаста

А. У.

Організатар мас у барацьбе за сьвінагадоўлю

У сьвінагадоўчым саўгасе „Вішнёўка“ з 16-га сакавіка пачала выдавацца шматтыражка. Шматтыражка актыўна змагаецца і організуе ініцыятыву шырокіх мас рабочых на барацьбу за спэцыялізацыю саўгасу, разьвіцьцё сьвінагадоўлі, на бальшавіцкую падрыхтоўку да сяўбы.

З самага пачатку свайго іскаваньня шматтыражка згуртавала вакол сябе ўдарнікаў,—рабкораў і юнкораў якія разам з газэтай актыўна змагаюцца за разьвіцьцё сьвінагадоўлі. Газэта ўвялася сачыць за тым, як даглядаюцца сьвіньні, у якім стане будаўніцтва сьвінарнікаў, як падводзіцца кармавая база пад сьвінагадоўлю. Газэта выступіла ў паход за 12 парасят.

Праз організацыю рэйдаў і налётаў рабкораў-ударнікаў, газэта актыўна дапамагае кіраўніцтву і грамадзкім організацыям саўгасу ў ліквідацыі недахопаў гаспадаркі. Газэта правяла актыўную барацьбу за пераход саўгасу на гаспадарчы разрахунак.

Аднак, трэба адзначыць, што комсамольская ячэйка мала дапамагае ў працы шматтыражкі, не праводзіць сыстэматычнай працы з юнкорамі.

Райком комсамолу павінен дапамагчы ячэйцы саўгасу „Вішнёўка“ наладзіць работу з юнкорамі і організаваць усю рабочую моладзь саўгасу на актыўную дапамогу шматтыражцы ў яе барацьбе за спэцыялізацыю саўгасу і падрыхтоўку да сяўбы.

П.

З многіх на штурм — адзінкі адсталых вучастка

КОМУНАРАВЕЦ

РАБОЧАЕ ВОКА

Летась да дня друку па БССР налічвалася каля 20 фабрычна-заводзкіх газэт. Мінулы год быў годам крутога пералому. Побач з гіганцкім ростам вытворчых сіл краіны, выкананьнем бальшавіцкіх плянаў будаўніцтва, расьлі і растуць фабрычна-заводзкія газэты—баявыя прапагандыстыя, агітатары і організатары працоўных мас.

Газэты фабрык і заводаў, якія нараджаюцца ў фабрычных корпусах, становяцца конкрэтнымі барацьбітамі і організатарамі бальшавіцкіх спраў.

„Комунаравец“ — газэта рабочага колектыву заводу „Комунар“ (Менск) —адна з першых падхапіла заклік т. Сталіна і на сваіх старонках разгарнула сыстэматычную барацьбу за аўлаўданьне тэхнікай. Выпрацаваны конкрэтны плян дзеяньня зьяўляецца праграмай гэтага паходу.

Вялікую барацьбу правялі газэты за якасьць продукцыі. „Чырвоны абутнік“ (Менск, Абутковая ф-ка) і „Рабочае вока“ (Менск, скурзавод „Бальшавік) сыстэматычна змагаліся з усімі непаладкамі, якія перашкаджаюць лепшай організацыі працы і палепшаньню якасьці продукцыі.

Але газэты ня здолелі правільна падхапіць галоўнае, мобілізаваць увагу на галоўных пытаньнях дню, як „Чырвоны абутнік“ так і „Рабочае вока“ слаба адгукнуліся на заклік комсамольцаў ф-кі „Лекерта“, не паставілі канвэер якасьці як конкрэтную справу, шляхам разгортваньня якой трэба дамагацца перамогі.

У барацьбе за якасьць шматтыражка Менскай абутковай фабрыкі „Чырвоны Абутнік“ паказала прыклад настойлівай бальшавіцкай упартай барацьбы.

На ф-цы прарыў у выкананьні якасных паказчыкаў.

У адным з студзеньскіх нумароў газэта констатуе:

„Справа з якасьцю ў нас не паляпшаецца, а пагаршаецца: у кастрычніку мы мелі 15 проц. адхіленьня ад першага гатунку, з іх 0,57 проц. браку. У сьнежні—20,5 проц. адхіленьня ад першага гатунку, з іх браку 1,57 проц. За 20 дзён студзеня—25,87 проц. адхіленьня ад першага гатунку, процант браку значна павялічыўся“.

Зварочваючы ўвагу грамадзкасьці на факт пагаршэньня якасьці продукцыі, газэта патрабуе ўпартую штодзённую барацьбу за паляпшэньне якасьці. Газэта кліча: „па-бальшавіцку змагацца за якасьць“. Ня толькі кліча, а выкрывае прычыны росту браку і паказвае шляхі іх зьнішчэньня.

Даючы з нумару у нумар матар'ялы аб становішчы выкананьня якасных паказчыкаў, прапановы да паляпшэньня якасьці, газэта ў сьвяточным першамайскім нумары паказвае ўдарныя брыгады, комуны, якія вышлі наперад у барацьбе за якасьць.

Пры ўсёй значнай працы, якую рабіць газэта ў барацьбе за якасьць „Чырвоны Абутнік“ за ўвесь час 1931 году амаль абыходзіць такія важныя моманты барацьбы за якасьць як паход за аўладаньне тэхнікай і конвэер якасьці.

Матар'ял газэты па пытаньню аўладаньня тэхнікай быў несыстэматычным, мала абгрунтаваным фактычным матар'яле фабрыкі аднымі з нумароў у газэце вынос каштоўная прапанова аб організ ў шматтыражцы старонкі барацьб аўладаньне тэхнікай. Але ў далей нумарох гэтая прапанова не ажы цяўляецца.

З вялікім багажом друкаванага ва падыходзіць пролетарыят да друку. Дзесяткі і сотні шматтыра пад кіраўніцтвам комуністычнай ты змагаюцца за 5-цігодку, за і 1.040.

Але слабы, зусім нязначны ў прымае комсамол у працы фабры заводзкага друку. Яркім прыкла гэтага можа служыць газэта „Чыр ны абутнік“.

Працы комсамолу ў газэце ня даць. Ня гледзячы на тое, што га вельмі настойліва зварачвалася да к самолу фабрыкі. Зьмешчаныя доп „Фабрыка патрабуе комсамольс штурму“, якія высоўвалі пытан шэфства над машынамі, якія канча словамі: „слова за комсамольскай ладзьдзю“, засталіся без адказу. ват пасьля зьмешчанага ў газэце пытаньня рэдколегіі да сэкратара к самольскага колектыву тав. Сагал ча, чаму комсамольцы ня пішуц „Чырвоны Абутнік“ аб дзейнас сваёй організацыі,—засталося бяз гуку.

У нас ёсьць значныя прарывы росту продукцыйнасьці працы. вырасла толькі на 2 проц. звыш п ну, а заработная плата ўзрасла бол чым на 10 проц. Гэта значыць, пры пераходзе на 7-мігадзінны ра чы дзень, калі ўстанаўлівалі нор выпрацоўкі, мы ня ўзялі стаўкі на працоўку лепшага ўдарніка. Правед ныя рацыяналізатарскія мерапрые вы недастаткова ўлічваліся пры ск даньні норм. Так пачынае „Чырво Абутнік“ барацьбу за перапрацоў норм выпрацоўкі. Лёзунгам, наво якога організоўваецца ўся маса раб чых фабрыкі, гэта—„раўненьне на працоўку лепшага рабочага ўдарнік

І ў першамайскім нумары газэ паказвае вынікі працы. Нарада бр гад па строчцы палатна і фольг, стро цы падноскаў, заднікаў, наскоў, ам рыканскіх рамней, якая адбылася пытаньню перагляду норм, ухвалі ўстаноўку: максымальна - тэхнічн нормы на лепшага ўдарніка і высун ла сустрэчныя лічбы. Брыгада па а рысоўцы верху павялічвае максымал на-тэхнічную норму на 100 про Брыгада па строчцы падноскаў 10 пар.

„Вось наш практычны ўдзел у ра гортваньні вышэйшых форм комун стычнай працы“—робіць вывад раб чы—сябра комуны.

І ў барацьбе за сустрэчную норм выпрацоўкі газэта адзначае: „у пер глядзе норм слаба ўдзельнічае мал дая гвардыя“. І сапраўды комсамол скі колектыў фабрыкі зусім сла ўдзельнічаў у гэтай рабоце.

У Ленінскія дні організав ны новыя комуны. Газэта піша „ ленінскія дні брыгада клейкі заднікаў і наскоў, брыгада падачы работы брыгада абложэньняў пераходзяць да вышэйшых форм соцыялістычных ор ганізацыі працы, організоўваюцца комуны“ А побач „зводка выкананьн прампінпляну за 20 дзён студзеня п комуне аклейкі заднікаў і наскоў.

Удзельнікі комун найлепшыя зма гары за прамфінплян. Бярэце прыкла з лепшых. „Газэта мобілізоўвае ўваг ўсяе рабочае грамадзкасьці фабрык навакол працы лепшых ўдарнікаў.

„Хто першы прыме выклік член комуны Розы Кап.—пытаецца газэта калі ўдарніца—комунарка высоўвае сустрэчную норму ў 1500 пар.

Газэта не абмяжоўваецца паказам лепшых. Горшыя, ілжэ-ударнікі, прагульшчыкі праходзяць на старонках газэтах, ганьбуюцца ўсім ударным рабочым колектывам.

Да дня друку засталося 15 дзён. Гэтыя дні павінны быць скарыстаны для праверкі працы комсамольскай організацыі ў друку, для лепшай організацыі і перабудовы газэт і палепшаньня удзелу комсамолу у іх.

Неабходна ажывіць працу комсамольскіх кутноў і старонак. скарыстоўваючы газэтныя калёнкі для мобілізацыі рабочай моладзі. для ўцягненьня новых колаў працоўнай моладзі у рады ленінскага комсамолу

„Час бальшавікам стаць самім спэцыялістымі“. (СТАЛІН)

АЎЛАДАЦЬ ТЭХНІКАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ПРАМФІНПЛЯН

Паход за тэхніку—паход за 518 і 1040, за тэмпы плюс якасьць. Віцебск слаба выконвае ўзятыя абавязкі. ЦКК РСІ, ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ абвяшчаюць двухдэкаднік праверкі ходу барацьбы за тэхніку

Выходзьце на баявую праверку, на штурм вышынь тэхнікі, змагайцеся за трэці рашаючы!

Паход за тэхніку разгарнуўся па ўсёй краіне. У адказ на заклік тав. Сталіна былі створаны і стварающца новыя ўдарныя брыгады, організуюцца гурткі тэхнікі, гурткі рацыяналізатараў вытворчасьці.

Комсамолія Віцебску ўключылася ў паход за тэхніку, выпрацавала конкрэтны плян дзеяньняў і ўзяла на сябе рад абавязкаў.

„Чырвоная Зьмена“ правяла праверку выкананьня ўзятых абавязкаў. Праверка паказала, што барацьба за аўладаньне тэхнікай у Віцебску слаба ўвязана з барацьбой за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за яго якасныя паказчыкі.

Праверка ўскалыхнула Віцебскую організацыю. Праведзеныя па прадпрыемствах тэхнічныя трывогі далі пэўны зрух у працы організацыі. Апошнія весткі сьведчаць аб дасягнутым пераломе, які неабходна замацаваць на далейшы час.

Зьмешчаны сёньня плян комсамолу панчошнай фабрыкі можа быць узорам правільнай пастаноўкі паходу за тэхніку, уменьня мобілізаваць тэхнічныя веды на службу прамфінпляну.

Барацьбу за тэхніку—на вышэйшую ступень.

ЦКК НК РСІ, ЦК ЛКСМБ і ЦСПСБ абвясьцілі двухдэкаднік праверкі разгортваньня паходу за тэхніку, наколькі гэты паход узьняты на вышэйшую ступень, наколькі ён стаў барацьбой за прамфінплян, за тэмпы плюс якасьць.

Далей разгортваючы паход за тэхніку, мы павінны яшчэ больш ахапіць самыя шырокія масы тэхнічнай вучобай, глыбей вывучыць тэхніку вытворчасьці, змагацца за зьніжэньне сабекошту і ўздым якасьці продукцыі.

Віцебск на аглядзе

Рапартуюць з месц

— ФЗВ мэталістых:

Акрамя організацыі гурткоў па вывучэньню тэхнікі, стварэньня штабу па кіраўніцтву і організацыі тэхнічнага бою, нічога зроблена ня было.

Вывучэньне тэхнікі ня ўвязана з барацьбою за выкананьне прамфінпляну.

— Панчошная фабрыка.

Створана скразная ўдарная брыгада імя Сталіна па барацьбе за якасьць, якая ахапіла 30 чалавек. У цэхах створаны 6 тэхнічных гурткоў.

Усе мэханікі замацаваліся да канца 5-цігодкі.

— МББ чыгунка (ст. Віцебск)

Пытаньне аб паходзе за тэхніку было пастаўлена на комсамольскіх сходах, вынесена пастанова організаваць гурткі па вывучэньню тэхнікі. Гэта пытаньне абгаворана таксама на сходзе беспартыйнай моладзі. У выніку організаваны 3 гурткі: у такарным цэху, паравозарамонтным і вагона-рамонтных майстэрнях.

— Гарбарня імя „Ялісеева“.

Ініцыятываю комсамольскай ячэйкі організавана 2 гурткі па вывучэньню тэхнікі. Адзін гурток—у штамповачным цэху, а другі ў астатніх.

На вытворчасьці праца разгорнута неластаткова. Профсаюзныя організацыі абмежаваліся толькі тым, што паставілі пытаньне на агульным сходзе рабочых.

— Воласа-прадзільная ф-ка

Рабочыя з зацікаўленасьцю адносяцца да тэхнічнай вучобы і актыўна ўдзельнічаюць у організацыі гурткоў. Акрамя партыйцаў і комсамольцаў, у гурткі запісаліся 32 беспартыйныя рабочыя.

— „Сьцяг індустрыялізацыі“

Комсамольская організацыя павяла за сабою ўсю рабочую моладзь у паход за тэхніку. Прыкладнаю зьяўляецца 8-ая маладзёжная група, якая вышла з вялікім перавыкананьнем прамфінпляну ў першым квартале, даўшы 113 проц.

— Фабрыка Лекерта.

Усе пастановы партыйнага і комсамольскага колектыву дагэтуль не праводзяцца ў жыцьцё. Організаваныя гурткі па аўладаньню тэхнікай не працуюць. Ніякай растлумачальнай працы няма.

— ФЗВ ф-кі „Дзьвіна“

Лёзунг аб паходзе за тэхніку школа падхапіла своечасова. Каб лепш паставіць практыку, ф-ка адвяла спэцыяльны цэх для школы. Ёсьць так званая школа аднадзёнка, якая распрацоўвае пытаньне рацыяналізацыі вытворчасьці і інш.

Гэта школа адно з конкрэтных мерапрыемстваў у галіне барацьбы за тэхніку.

Пазыка тэхнікі



Паход за тэхніку выявіў шмат цікавых форм організацыі тэхнічнай вучобы. На Ленінградзкім вагонабудаўнічым заводзе імя Ягорава выпушчана „пазыка тэхнікі“, распаўсюджана ўжо 390 облігацый. Атрымаўшы аблігацыю пазыкі бярэ на сябе абавязак наведваць організаваныя на заводзе вытворчыя тэхнічныя курсы. Кожнае наведваньне азначаецца пагашэньнем купона облігацыі. Пагасіўшыя поўнасьцю ўсе купоны і пасьпяхова прайшоўшыя курс заняткаў будуць прэміявацца месцамі ў санаторыі, доме адпачынку і г. д.

На здымку: пазыка тэхнікі.

„Лекертаўцы“ здаюць позыцыі

Абутковая ф-ка імя Лекорта яшчэ не выйшла ў паход за тэхніку. Тое што прарабіў комсамольскі колектыў ф-кі ў гэтай галіне яшчэ нельга назваць ажыцьцяўленьне задач якія стаяць перад комсамолам.

Організаваныя гурткі тэхнікі, ня гледзячы на складзеныя ўмовы, не працуюць.

Уся маса комсамольцаў і беспартыйнай рабочай моладзі не мобілізавана на выкананьне лёзунгу Сталіна за аўладаньне тэхнікай. Прамовы т. Сталіна і пастанова ЦК УсеЛКСМ на цэхячэйках не распрацоўваюцца

Комсамольскі колектыў нічым не рэагуе нават на тое што і рабочыя прапановы па палепшаньню якасьці продукцыі, палепшаньню вытворчасьці працы ня выконваецца. А вінтавы цэх за люты месяц даў 159 пар бракаванага абутку. Праца па канвэеру якасьці значна аслабла.

Адсутнасьць працы па аўладаньню тэхнікай, барацьбы за якасьць продукцыі адсутнасьць масавага рацыяналізатарскага руху яшчэ больш паглыбляе прарыў ў выкананьні прамфінпляну. За гэта павінен адказваць комсамольскі колектыў фабрыкі.

Брыгадыр „ЧЗ“ А. П.

Баявая праверка павінна выявіць:

— Ці давездена да кожнага рабочага прамова т. Сталіна на конфэрэнцыі гаспадарнікаў і пастанова прэзыдыуму ЦСПСБ аб аўладаньні тэхнікай і як яны популярызаваны.

Якія мерапрыемствы ўжыты у сувязі з гэтым па лініі гаспадарчых, профсаюзных, партыйных і комсамольскіх організацый.

Колькі організавана вытворча-тэхнічных гурткоў і курсаў, колькі імі ахоплена рабочых, адміністрацыйна-гаспадарча-тэхнічнага пэрсоналу, колькі організавана гурткоў паасобных профэсый, як яны забясьпечаны кіраўнікамі і навучальнымі прыладамі, іх мэтавая ўстаноўка, па якіх праграмах праходзяць заняткі, колькі у гэтых гурткох комсамольцаў і партыйцаў.

Ці існуе на прадпрыемстве рацыяналізатарскае бюро, альбо рацыяналізатар „Бриз“ (бюро рабочага вынаходзтва), колькі у іх аслабанёных працаўнікоў, якую дапамогу яны аказваюць рабочым вынаходкам.

Ці ёсьць у бібліотэцы, чытальні, кіоску-перасоўцы тэхнічная літаратура ці створаны выстаўкі тэхнічнай літаратуры, рэкомэндацыйныя сьпісы і г. д.

Што робяць клюбы і чырвоныя куткі для аўладаньня тэхнікай, колькі прачытана лекцый і дакладаў на вытворчыя тэмы.

Як адбіваецца паход за аўладаньнэ тэнікай у насьценгазэтах, шматтыражках, лёзунгах і плякатах.

Ці організаваны ячэйкі т-ва „Тэхніка масам“.

Разгарнуць баявую праверку

Усім ячэйкам КП(б), ЛКСМБ і фабзаўкому

Выкананьне лёзунгу—дагнаць і перагнаць у тэхнічна-эконамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны магчыма толькі пры той умове, калі самыя шырокія масы рабочае клясы аўладаюць тэхнікай.

Заклік тав. Сталіна і дырэктыва ЦСПСБ ставяць перад партыяй і рабочай клясай гэтую задачу ва ўсю шыр, і яна павінна быць выканана ў найкарацейшы тэрмін. Павышэньне кваліфікацыі без адрыву ад вытворчасьці, дзякуючы належнай увазе партыйных, профэсыянальных, комсамольскіх і гаспадарчых організацый узмацніла ўздым рабочага вынаходзтва і ініцыятывы на вырашэньня вялізарнейшых задач, якія стаяць перад рабочаю клясай, што будуе соцыялізм.

ЦКК-НК РСІБел., ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ праводзяць масавую праверку таго, як організавана работа на прадпрыемствах у галіне аўладаньня тэхнікай. Праведзены ў красавіку месячны паход за аўладаньне тэхнікай даў станоўчыя вынікі. Праверка павінна яшчэ больш мобілізаваць увагу рабочых і організацый на тое, што неабходна аўладаць тэхнікай, замацаваць дасягнутыя посьпехі, выявіць перашкоды, вызначыць і ажыцьцявіць мерапрыемствы, якія-б дапамаглі зьнішчыць гэтыя перашкоды.

Неабходна тэрмінова правесьці самаправерку з тым, каб выявіць у якім стане знаходзіцца справа аўладаньня тэхнікай на прадпрыемствах і ці адпавядае яна рабочай програме. Дзеля гэтага неабходна скласьці брыгады з прадстаўнікоў ячэек КП(б), ЛКСМБ, ФЗМК, шматтыражкі, насьценгазэты, гаспадарнікаў, ударнікаў і лёгкай кавалерыі.

Вынікі праверкі абгаварыць на агульным сходзе, альбо на шырокіх рабочых конфэрэнцыях, прыцягнуўшы да гэтага адміністрацыйна-тэхнічны пэрсонал.

Матар'ялы праверкі і пратакол абгаварэньня яе вынікаў даслаць у ЦКК КП(б), НК РСІ не пазьней 25-га чэрвеня г. г.

Старшыня ЦКК РСІ—Калнін
Старшыня СЦПСБ—Рыжоў
Сэкратар ЦК ЛКСМБ—Гуткін

***

ЦКК—НК РСІБел. сумесна з ЦК ЛКСМБ і ЦСПСБ праводзіць праверку організацыі работы ў галіне аўладаньня тэхнікай.

Пры ЦКК НК РСІ створаны штаб, які праводзіць 2-х дэкаднік самаправеркі. У штаб уваходзяць прадстаўнікі ЦКК НК РСІ, ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ, рэдакцый газэт „Зьвязда“, „Рабочий“ і „Чырвоная Зьмена“.

Задача штабу—дапамагчы мясцом організаваць самаправерку па аўладаньню тэхнікай, падвесьці агульныя вынікі з тым, каб паставіць іх на Прэзыдыуме РКК, ЦКК—РСІ і ЦСПСБ.

Каб лепш правесьці самаправерку на мясцох у раёнах неабходна організаваць аналёгічныя штабы з прадстаўнікоў Гар. РайКК, РСІ, профсаветаў, гар. райкамолу і рэдакцый раённага і гарадзкога друку.

Штабы павінны прасачыць за організацыяй самаправеркі непасрэдна на прадпрыемствах і дапамагчы скласьці вынікі па раёне, каб паставіць іх на прэзыдыуме гор. РайКК, РСІ і гар. профсавету.

Прыкладны плян

тэхнічнай вучобы комсамолу і беспартыйнай рабочай моладзі панчошнай ф-кі г. Віцебску (друкуецца ў скарочаным выглядзе)

Гэты плян працы тэхнічнага гуртка на панчошнай фабрыцы г. Віцебску ёсьць конкрэтны плян аўладаньня тэхнікай сваёй машыны.

Гэта ўзор перакладу лёзунгу т. Сталіна аб аўладаньні тэхнікай на мову тэхнікі.

Гэта першы крок па шляху аўладаньня тэхнікай. Ён каштоўны тым, што прадугледжвае не абстрактнае, адцягненае вывучэньне тэхнікі, а конкрэтнае азнаямленьне з машынай, на якой працуюць, каб ведаць, якія магчымы папсуцьці, як іх выправіць, як лепш працаваць.

Выкананьне гэтага пляну—парука посьпеху.

Гэтыя веды ў руках ударніка даюць магчымасьць хутчэй выканаць узятыя самаабязацельствы па зьнішчэньню браку, па падвышэньню вытворчасьці працы.

Гэта адзін з вучасткаў барацьбы за выкананьне прамфінпляну.

Падрыхтоўчы аддзел.—Вывучыць.

1. Уласьцівасьці вязальнай пражы. Мяккасьць. Адлогасьць. Роўнасьць. Чыстата. Прызначэньне пражы. Падрыхтоўчыя працэсы. Намотка пражы на бутэлечную шпулю, Конічную бабіну. Нітачная пража.

2. Род валакон, якія скарыстоўваюцца на выраб вязальнае пражы. Сарты бавоўны, Спосабы часаньня. Лік кручэньня на 1 куб. даўжыні пражы па нумарох.

4. Недахопы пражы. Вільготнасьць пражы па роду валакна.

8. Штучны шоўк. Спосабы падрыхтоўкі пражы, нумары, якія скарыстоўваюцца на вырабы і прызначэньне пражы.

Частка 2-ая

1. Шпульна-матальныя машыны. Нормальныя тыпы машын. Колькасьць верацён у машыне. Мэханізм руху машыны. Хуткасьць варацён. Спосаб намоткі пражы на бутэлькавую шпулю. Вытворчасьць машыны (тэорэтычная). Парафінэры. Тэхнічна магчымая норма вытворчасьці.

2. Унівэрсальная машына для намоткі пражы на конічную базу. Ніткаводнік. Самастойны пуск і спыненьне кожнага верацяна...

3. Роля вузлоў і ўплыў іх на працу вязальных машын. Круглы вузел. Ткацкі вузел. Вузлавязальнікі. Ужываньне матальных машын і рознага роду пражы, якая розьніцца па валакну.

5. Абслугоўваньне шпульнай машыны. Тэорэтычная і практычная вытворчасьць машыны.

6. Організацыя матальнага аддзелу. Спосаб вучоту, выдачы і прыёму намотачнай пражы.

Нажніцы і Клеймкегель

1. Устаноўка нажніц і клеймкегеляў, іх прызначэньне, недахопы ў працы і выпраўленьне іх.

2. Састаўныя часткі нажніц, клеймкегеля.

4. Асаблівасьці ў працы.

Цыліндар, голкі, плаціны, замкі і інш.

1. Састаўныя часткі цыліндра. 2. Выемы і іх прызначэньне. 3. Недахопы і іх выпраўленьне. 8. Узаемаадносіны голак з плацінамі 13 Урэгуліроўка плаціна-воднага круга. 14. Перавод машын жаночых на іншыя вырабы. 15. Вымер ліку зваротаў машыны і яе тэорэтычная вытворчасьць. 16. Процэсы аддзелкі ў панчошнай вытворчасьці.

Штурмуючы прарывы ў выкананьні прамфінпляну, сустрэнем юбілей „Ч. З."

Ударныя брыгады будаўнікоў соцыялізму нясуць рапарты юбіляру

Прывітаньне ад лепшых ударнікаў палёў

ЦК Комсамолу Беларусі і яго баявому органу—„Чырвонай Зьмене" ад зьлёту маладых колгасьнікаў Расоншчыны—баявое колгаснае прывітаньне

Зьлёт маладых колгасьнікаў, сабраўшыся ў пэрыод пачатку вясновых работ 2-й бальшавіцкай вясны, запэўнівае ЦК Комсамолу і „Чырвоную Зьмену" у тым, што, пад кіраўніцтвам Ленінскага комсамолу і яго Цэнтральнага камітэту, мы па-ударнаму выканаем усе задачы, пастаўленыя партыяй перад колгасамі ў 2-ую бальшавіцкую вясну. У рашучай барацьбе з кулацтвам і яго агентамі—правымі і „левымі" опортуністымі, колгасьнікі з посьпехам будуць будаваць сваю соцыялістычную гаспадарку.

Маладыя колгасьнікі, сабраўшыся на свой першы зьлёт, ад імя ўсіх маладых колгасьнікаў Расоншчыны запэўніваюць ЦК і „Чыр. Зьмену", што яны будуць лепшымі ўдарнікамі колгасных палёў.

Няхай жыве суцэльная колектывізацыя і ліквідацыя на гэтай аснове кулацтва.

Няхай жыве ленінская партыя і яе цэнтральны камітэт.

Няхай жыве ленінскі комсамол—кіраўнік рабочай і працоўнай сялянскай моладзі.

Прэзыдыум зьлёту.

Па-ударнаму рыхтуемся да юбілею

Раённая конфэрэнцыя колгаснае моладзі, склікаяная ў гонар 10-цігадовага юбілею „Чырвонай зьмены", прайшла з вялікім уздымам. Прысутнічала 300 чалавек моладзі. Шляхам выклікаў праведзена дадатковая падпіска на „Чырвоную зьмену", якая дала 113 экз.

Зараз падпіска ўзьнялася да 355 экз. Кантрольныя заданьні перавыкана1ы на 44,5 проц. Падпіска ўся доўгатэрміновая,—ад 6-ці месяцаў і да канца 5-цігодкі. **Сідарук**

Віцебск рапартуе:

Мастацкі тэхнікум

Програма за 1-е паўгодзьдзе выканана да IX-га зьезду комсамолу, на 2 месяцы раней тэрміну, якасьць добрая. Праз грамадзкі буксір зьнішчана непасьпяховасьць студэнтаў, нават вяскончыўшых 7-мігодкі. Праца па спецыяльных дысцыплінах рэзка пераломлена: з 2-га паўгодзьдзя тэхнікум працуе колектыўным скрозным мэтадам, які цясьней зьвязаў працу і падрыхтоўку новых пролетарскіх спэцыялістаў з нашым жыцьцём і працай.

Па тэхнікуме праводзіцца экономічная эстафэта. Мэта эстафэты—барацьба за якасьць вучобы, за падрыхтоўку ў ўстаноўлены партыяй і савецкай уладай тэрмін добраякасных спэцыялістаў. Вынікі эстафэты—уздым якасьці вучобы, рацыяналізатарскі рух, уздым вытворчай і політычнай актыўнасьці студэнцтва.

Па першаму маршруту (фініш якога павінен быць 1-га мая) III курсы: 1-шы пэд., 1-шы інструктарскі і III-ці пэд. прышлі 19-га красавіка.

Выканалі програмы цалкам за красавік, ня маючы ніводнага адстаючага. Дасягнута добрая якасьць працы. 1-га мая—фініш па астатніх маршрутах. Колектыўныя групы пераключылі сваю працу да пэршамайскіх сьвят (практыкум).

Разгорнута ўдарніцтва і соцспаборніцтва на лепшую продукцыю, як з боку фармальнага так і з боку ідэолёгічнага. Ударнікі тэхнікуму цалкам ахопленыя грамадзкай працай і політычнай вучобай. Лепшыя ўдарнікі ўступаюць у КСМ. Разьвёрстка ГК КСМ на выпіску 70 экз. „Чырвонай Зьмены" перавыканана—92 студэнты, якія зараз ў т-ме (астатнія праводзяць на вёсцы пасеўкампанію, або ў адпуску), выпісваюць 90 экз.

Створаны тры насьценкораўскія брыгады імя „Ч. З." Брыгады актыўна асьвятляюць працу курсаў і груп. Організаваны пост „Ч. З." Ударнікі запэўніваюць, што прыкладуць усе сілы каб даць краіне добраякасныя кадры пролетарскіх спэцыялістых.

Панчошная ф-ка

У адзнаку дзесяцігодзьдзя юбілею „Ч. З." мы, комсамольцы і беспартыйная моладзь панчошнай фабрыкі, рапартуем: раней у нас быў прарыў у выкананьні прамфінпляну, а за апошні час, дзякуючы энтузіязму рабочых ф-кі і парт. кіраўніцтву, мы маем зрух.

Апошняя пяцідзёнка дала выкананьне прамфінпляну на 101,2 проц., організавалі брыгады якасьці па ініцыятыве колектыву ЛКСМБ, ўцягнута ў рады КСМ 121 чал. моладзі.

Раней колектыў выпісваў 133 экз. „Чырвонай Зьмены", а сёньня мы маем 275 экз.

Бяром на сябе абавязкі: організаваць ня менш 2-х брыгад, уцягнуць 100 проц. рабочае моладзі ў рады ЛКСМБ, скласьці ў кожным цэху юнкораўскія брыгады „Ч. З.", давесьці тыраж „Ч. З." да 600 экз.

Хай жыве баявая газэта „Ч. З."

Хай жыве ленінскі комсамол.

Ячэйка ЛКСМБ пры 7-м будаўнічым вучастку МББ чыгункі

Ячэйка ЛКСМБ організавана 1-га красавіка 1931 году з 14 асоб. Да 10-цігадовага юбілею „Чырвонай Зьмены" ячэйка зрабіла наступнае:

Правяла працу па распаўсюджваньню газэты „Чырвоная Зьмена",—выпісана 92 экз.

Стварыла на 7-м будаўнічым вучастку 5 ударных брыгад імя „Чырвонай Зьмены" з 74 асоб.

Ячэйка да юбілею вырасла на 30 пр. уцягнула у гурткі па падрыхтоўцы ў комсамол 12 чалавек сэзоннай рабочай моладзі.

У далейшым ячэйка лічыць неабходным палепшыць працу з юнкорамі, стварыць юнкораўскія гурткі, уцягнуўшы ў іх рабочую моладзь. Весьці шырокую працу па распаўсюджваньню „Чырвонай Зьмены" сярод беспартыйнае моладзі.

Колектыў КСМ штотачнай ф-кі

Конфэрэнцыя моладзі Віцебскай шчотачнай ф-кі падагуліла працу баявога органу ЦК ЛКСМБ газэты „Чырвоная Зьмена". Конфэрэнцыя заяўляе, што да 10-гадовага юбілею „ЧЗ" наш колектыў КСМ мае наступныя дасягненьні:

Замест 30 проц. ахопу моладзі „Чырвонай Зьменай" мы зараз маем 80 проц. Мы ставім сваёй задачай, каб кожны комсамолец і малады рабочы чытаў сваю газэту „Чырвоная Зьмена".

Намі праведзена растлумачальная праца сярод рабочых. У выніку—організаваны дзьве ўдарныя брыгады імя „ЧЗ".

Колектыў КСМ ф-кі „Дзьвіна"

„Чырвоная Зьмена" ня працягу 10-год зьяўлялася лепшым організатарам комсамольскай і беспартыйнай моладзі на ажыцьцяўленьне задач, якія стаяць парад партыяй, комсамолам і ўсёй рабочай клясай.

У сувязі з юбілеем „Чырвонай Зьмены" колектыў ф-кі „Дзьвіна" правёў конфэрэнцыю аб значэньні „Чырвонай Зьмены", Організаваны дзьве ўдарныя брыгады імя „ЧЗ", комсамольцы і беспартыйная моладзь выпісалі 370 экз. „ЧЗ". У часе абедзенага перапынку праводзіцца громкая чытка газэты „Чырвоная Зьмена" у прысутнасьці старэйшых рабочых.

Да 10-гадовага юбілею „Чырвонай Зьмены" комсамолія ф-кі „Дзьвіна" абвяшчае сябе мобілізаванай на выкананьне прамфінпляну і на пакрыцьцё прарыву перщага кварталу 3-га, рашаючага году 5-ці годкі.

Даб'емся пералому ў шахматна-шашачнай працы

Зараз па становішчу шахматна-шашачнай працы Беларусь знаходзіцца па адным з апошніх месцаў сярод саюзных рэспублік. Шахматна-шашачныя сэкцыі пры проф. організацыях і шахматна-шашачныя сэктары пры саветах фізкультуры ня існуюць. У выніку шахматна-шашачны рух прадастаўлены самацёку. Ёсьць раёны, у якіх адсутнасьць усякага кіраўніцтва прывяла да поўнага зрыву шахматна-шашачнай працы. Напрыклад: у г. Віцебску, у 1927-28 г. г. працавала 23 ш.-ш. гурткі, а зараз... ніводнага—усе разваліліся!

Чым тлумачыцца такое ганебнае становішча ш.-ш. працы ў БССР? Па-першае, бязумоўна, тым, што профорганізацыі і саветы фізкультуры не разумеюць, што ш.-ш. праца—гэта частка фізкультурнай ! агульнай культмасавай працы, і ў зьвязку з гэтым недаацэньваюць значэньня ш.-ш. руху, як руху, праз які можна ўцягнуць шырокія колы як рабочай моладзі, так і дарослых рабочых да актыўнага ўдзелу ў соцыялістычным будаўніцтве.

Гэткае абураючае становішча мы маем зараз, ня гледзячы на пастанову Сэкратарыяту УсеЦСПС аб узмацненьні ш.-ш. працы, пастаноў пленуму Усесаюзнага ш.-ш. камітэту пры ВСФК СССР (па дакладу т. Н. В, Крыленка) аб перабудове ш.-ш. працы, ня гледзячы на спэцыяльную пастанову ш.-ш. сэкцыі УсеЦСПС аб нездавальняючым становішчы ш.-ш. працы па БССР.

Зараз, згодна пастановы Сэкратарыяту УсеЦСПС праводзіцца ўсесаюзнае ш.-ш. спаборніцтва профсаюзаў, якія праходзяць па наступных этапах:

1. Фабрычна заводзкія спартакіяды па шахматам і шашкам (15-III—15-IV);
2. Рэспубліканскія ўнутрысаюзныя турніры (15-V—1-VI);
3. Усесаюзныя, унутрысаюзныя турніры (з 1-VI);
4. Усесаюзныя, міжсаюзныя турніры на пяршынство УсеЦСПС (з 15-VI);
5. Удзел 20-ці рабочых, рабочых-шахматыстых ад проф. саюзаў СССР у міжнародных рабочых шахматных спаборніцтвах (Бэрлін—у ліпені).

Асаблівую важнасьць набывае першы этап спартакіяды, які трэба скарыстаць для організацыі ш.-ш. гурткоў на прадпрыемствах, стварэньня сэкцый пры бюро фізкультуры і агульнай перабудовы ш.-ш. працы ў бок максымальнага набліжэньня яе да вытворчасьці.

Адзначаем, што ў БССР, дзе патрэбнасьць у правядзеньні фабрычна-заводзкіх спартакіяд, як сродку перабудовы ш.-ш. працы, асабліва неабходна, падрыхтоўка і правядзеньне спартакіяд праходзяць маруднымі тэмпамі, бяз удзелу грамадзкасьці. Ёсьць прадпрыемствы, дзе яшчэ не пачата падрыхтоўчая праца да правядзеньня спартакіяд („Комунар", „Ударнік"—Менск, „Дзьвіна"—Віцебск, „Вэзувій"—Гомель).

Рад фабкомаў сустрэў правядзеньне спартакіяд варожа. Старшыня фабкому абутковай фабрыкі імя Лекерта, на прапанову рабочага гэтай фабрыкі адпусьціць 10 рубл., каб закупіць інвэнтар, і дазволіць яму правесьці запіс жадаючых удзельнічаць, адказаў: „Пакуль мы не атрымаем офіцыйнай адносіны гарпрофсавету аб правядзеньні спартакіяд (ня гледзячы на тое, што пастанова была надрукавана ў газ. „Віцебскі пролетары"), я не дазволю іх праводзіць. Старшыня Віцебскага скурзаводу адмовіў праводзіць спаборніцтва на прадпрыемстве ў сувязі з тым, што пераможнік іх павінен будзе ўдзельнічаць у рэспубліканскім турніры, што зьвязана з сродкамі. Культработніца ф-кі „Комунарка" (Менск) адмовілася праводзіць спаборніцтва „за недахопам часу", Па такіх фактах трэба жорстка ўдарыць. У правядзеньні спартакіяд неабходзен пералом.

Комсамольскія ячэйкі стаяць у баку ад правядзеньня спартакіяд, ячэйкі павінны праверыць падрыхтоўку і ход спартакіяд, забясьпечыць іх сканчэньне ў вызначаны тэрмін.

Цьвёрда памятаючы, што тольні пры жорсткай барацьбе з усялякімі праявамі чэмпіёнства, каставасьці, профэсыяналізму сярод шахматыстых і шашыстых пры жорсткай барацьбе з недаацэнкай фабзаўмяоцкомамі шахматна-шашачнага руху, пасьцяхова правядзем спартакіяды і гэтым самым у шахматна-шашачным руху БССР наступіць пералом. Даб'емся яго.

Мазэль.



Аўладаць вышынямі будаўніцтва

Сёньня мы зьмяшчаем першы артыкул па другой тэме тэхнічнага кутка „Аўладаць вышынямі будаўніцтва".

Трэці год пяцігодкі вымагае небачаных тэмпаў будаўніцтва. На п… радку дня: навучыцца будаваць танней, хутчэй і лепш, навучыцца б… даваць за тым моцнасьцю на стагодзьдзі.

У паходзе за тэхніку змагацца за якасьць.

Організуйце колектыўную прапрацоўку і абгаварэньне зьмешчан… матар'ялу. Сачыце за працай кутка, дасылайце вашы водгукі, крыты… ку і пажаданьні.

Тэма 2-ая

Гутарка першая

Старыя традыцыі, звычкі і спосабы будаўніцтва, прымітыўнасьць, непрыстасаванасьць, важкасьць асноўных будаўнічых матар'ялаў, ні на чым неабаснаваная залішняя капітальнасьць будаўніцтва значна падаражаюць яго кошт.

Надзвычайная дарагоўля будаўніцтва, пры вельмі вялікіх укладаньнях, прыцягнула ўвагу плянуючых органаў і усяе грамадзкасьці да гэтага важнейшага вучастку соцыялістычнага наступу.

Ужо зараз ёсьць рад прапрацаваных рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, рад адзіных норм проэктаваньня, якія павінны быць неадкладна ажыцьцёўлены на будаўніцтве. Аднак, закаранеласьць, консэрватызм часткі адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсоналу будаўніцтва, слабая ўвага грамадзкасьці спрыяюць таму, што гэтыя мерапрыемствы не даюць належнага эфэкту.

Проблема рацыяналізацыі будаўніцтва вельмі шырокая і шматбаковая; у адным артыкуле немагчыма ахапіць ўсе шляхі рацыяналізацыі будаўніцтва. Я спынюся на рацыяналізацыі скарыстаньня рабсілы, а ў далейшым на рацыяналізацыі будаўнічых матар'ялаў.

На 1931 г. запроэктавана узьняць вытворчасьць працы рабочага будаўніка на 33 проц. Гэтую задачу нельга ажыцьцёвіць ва ўмовах дапатопных дзедаўскіх спосабаў працы. Неабходна максымальна ўдасканаліць усе процэсы будаўніцтва.

Дасканалая тэхнічная організацыя працы, злучаная з ударніцтвам, дасьць становучыя вынікі.

Зараз працоўны дзень рабочага мала ўшчыльнены. Вельмі частыя прастоі, недакладнасьці з разьмеркаваньнем рабочае сілы. Не рацыянальна скарыстоўваецца кваліфікаваная рабочая сіла, якая выконвае часам такія опэрацыі, якія з посьпехам можа выканаць некваліфікаваны рабочы. На некаторых пабудовах ня ўведзена мэханізацыя вытворчага процэсу.

Аб навуковай організацыі працы нашыя пабудовы нават і ня чулі. Між тым, як пры такой організацыі работ ёсьць магчымасьць узьняць вытворчасьць працы на 50—70 проц.

Кладка цэглы займае яшчэ адно з пачэсных месц ва ўсім комплексе будаўнічых опэрацый. Згодна 5-ці гадоваму пляну, цагляная кладка выражаецца ў 72 з паловай млн. куб. мтр.

Пры сучаснай, хоць і недаска… лай організацыі працы мулара, … ват складаныя рацыяналізатарс… мерапрыемствы ў напрамку ў… рацкаваньня рабочага месца, у… сканаленьня паасобных спосабаў … боты мулара, можна значна п… высіць вытворчасьць працы. Па… лічэньне вытворчасьці працы на … проц. зусім рэальна і магчыма … ўмовах нашых пабудоў. Улічваю… павялічэньне заработнай платы … 35 проц., яно дасьць. экономію … ўсім аб'ёме цаглянай кладкі ў 1… млн. рубл.

Ужываючы сыстэму Тэйлера … Гільбрэта, з 21 рабочага руху м… ляра—14 зусім лішнія, у тым … ку 12 вельмі цяжкія.

Ужываючы для тынкаваньня ам… рыканскі інструмант, можна дас… нуць падвойнай вытворчасьці пр… цы.

Вялікія вытворчыя магчымас… стварающца пры ўвядзеньні нов… організацыі працы па функцы… нальнай сыстэме, дзе асноўн… прынцыпам зьяўляецца надзел п… асобных работ на дробныя опэр… цыі. Тое, што зараз выконвае ад… рабочы падзяляецца на часткі … кожную з іх выконвае рабоч… спэцыялісты, адной вузкай функц… Гэтым дасягаецца значнае паск… раньне працы.

Такія прынцыпы організац… працы можна ўжываць і ва ўс… іншых відах будаўніцтва. Ужыў… прынцып функцыянальнай працы … сталярнай майстэрні Сьвінгасбуд… за кароткі тэрмін было дасягну… патаненьне каштоўнасьці вырабу а… нага кв. мэтра пераплёту на 20 … проц. (было 1 р. 80 к., зар… 65 к.)

Зусім ясна, што рэальнае і ра… вае павялічэньне вытворчасьці пр… цы дасягаецца ў тым выпадку, к… лі ўжываюцца найбольш дасканал… лыя мэтоды працы, што значна па… мяншае патрэбу ў будаўнічай ра… сіле паскарае тэмпы будоўлі.

А таму, задача максымальнай р… цыяналізацыі вытворчасьці працы—неадкладная задача сёньняшняг… дня. Ужо ў будаўнічым сэзон… 1931 г. неабходна максымальна ска… рыстаць новыя мэтоды працы.

Тэхнік Левін-Шчырын.

(Працяг будзе)

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ

Менскі гарадзкі камітэт ЛКСМБ, рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена" і аддзел энэргетыкі НДІ—Прамысловасьці склікае на 6-V—31 г., а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні Менгаркому (заля паседжаньняў) нараду спэцыялістых энэргетыкаў, ударнікаў, рацыяналізатараў і плянавікоў: Эльвод, В. Э. О. і ўсіх мэханізаваных фабрык і заводаў па пытаньню аб становішчы шэфства КСМ над электрыфікацыяй. На нараду запрашаюцца: усе інжынэры і тэхнікі па электро і цяпло-тэхніцы, ударнікі, сэкратары колектываў КСМ, старшыні рацыяналізатарскіх і плянава-опэрацыйных груп, эконом-працаўнікі мэханізаваных фабрык і заводаў.

З дакладамі выступаюць: па электротэхніцы—інжынэр Калмыкоў; па цяплотэхніцы—інжынэр Лабуцін.

Мен. Гарком ЛКСМБ

Рэдакцыя „Чырвонай Зьмены"

Аддзел энэргетыкі НДІ—Прамысловасьці

Друкарня імя таз. Сталіна.

Галоўлітбел № 599.